# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

3 студзеня 2019 г. № 1 г.Мінск

Аб прысуджэнні прэміі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь

1. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае захаванню і памнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцей і ідэй міласэрнасці, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2018 года:

аўтарскаму калектыву ў складзе Быкавай Юліі Віктараўны, аўтара музыкі і тэкстаў песень, Алейніка Яўгена Фёдаравіча, аўтара музыкі і тэкстаў песень, – за ўвасабленне тэмы малой радзімы ў сучасным эстрадным мастацтве, стварэнне цыкла высокамастацкіх вакальных твораў патрыятычнага напрамку;

калектыву Біблейскай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы і калектыву Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў касцёла камісіі Божага культу і дысцыпліны сакрамантаў пры Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі – за ажыццяўленне перакладаў з арыгінальных моў і выданне кніг Новага Запавету на беларускай мове, што спрыяе ўзбагачэнню духоўнай спадчыны;

калектыву грамадскай дабрачыннай арганізацыі ”Беларускі дзіцячы хоспіс“ – за актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, сцвярджэнне ідэй чалавекалюбства і міласэрнасці, значны ўклад у стварэнне нацыянальнай сістэмы дзіцячай паліятыўнай медыцынскай дапамогі, будаўніцтва на дабрачыннай аснове і арганізацыю работы дзіцячага хоспіса ў пасёлку Вопытны Мінскага раёна;

калектыву дзяржаўнай установы сацыяльнага абслугоўвання ”Веснаўскі дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця“ – за вялікі ўклад у зацвярджэнне маральных традыцый, ідэй чалавекалюбства і міласэрнасці, рэалізацыю мерапрыемстваў, накіраваных на сацыялізацыю асоб з абмежаванымі магчымасцямі.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2018 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызначыць, што грашовая частка адной прэміі дзеліцца ў роўных долях паміж калектывамі аўтараў, пазначаных у абзацы трэцім пункта 1 дадзенага Указа.

4. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

5. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь — А.Лукашэнка

10